падручніках, не адлюстроўвае сучасны антрапанімічны стан. Мы параўналі частотнасць выкарыстання імён у падручніку з найбольш папулярнымі ў сучасным грамадстве антрапонімамі. У артыкуле Т.Р.Трафімовіч і Н.У.Ждановіч "Из наблюдений над именниконом младших школьников города Минска" [4] прыводзяцца самыя частотныя імёны вучняў 1-4 класаў устаноў адукацыі горада Мінска. Выбарка ўключала імёны вучняў, якія нарадзіліся ў 2004-2007 гг. Было прааналізавана імёны 2590 рэспандэнтаў: для называння хлопчыкаў выкарыстана 128 імён, дзяўчат – 139. Імёны ў падручніках для 2-га класа складаюць толькі ¼ частку ад гэтай колькасці іменаў.

Сярод мужчынскіх найбольш частотнымі аказаліся імёны *Іван, Аляксей, Аляксандр, Уладзіслаў, Данііл, Мікіта*. У падручніку для 2 класа сустракаюцца некаторыя з іх (*Аляксандр – Саша, Данііл – Даніла, Уладзіслаў – Уладзік*). Імёны *Аляксей, Мікіта* не сустракаюцца. Сярод жаночых імён самымі папулярнымі з'яўляюцца імёны *Анастасія, Дар'я, Ганна, Марыя, Паліна, Кацярына, Елізавета,* з якіх у падручніках для 2 класа не ўжываеццца імёны *Елізавета* і *Анастасія*.

Можна адзначыць, што выбар імені ў падручніку абумоўлены, як правіла, вучэбнымі задачамі. Аднак значная колькасць антрапанімічнага матэрыялу дае настаўніку магчымасць прапанаваць вучням практыкаванні па фарміраванні уменняў утвараць і правільна ўжываць імёны ў маўленні. Пры гэтым варта адзначыць, што антрапонімы, якія сустракаюцца ў падручніку, не заўсёды адлюстроўваюць тэндэнцыі сучаснага наймення.

Спіс цытаваных крыніц:


1. Васілеўская, А.С. Да праблемы фарміравання антрапанімічнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў / А.С. Васілеўская, М.А. Вагулька // Региональная ономастика : проблемы и перспективы исследования: сб. научн. ст. / под научной редакцией А.М. Мезенко. – Витебск : ВГУ имени П.М.Машерова, 2016. – С. 343–345.
2. Вольскі, А.В. Літаратурнае чытанне : падруч. для 2-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання / А.В. Вольскі, І.А. Гімпель. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012. – 128 с.
3. Свірыдзенка, В.І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 2-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання: у 2 ч. / В.І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 2 ч.
4. Трофимович, Т.Г. Из наблюдений над именником младших школьников города Минска / Т.Г. Трофимович, Н.В. Жданович // Региональная ономастика : проблемы и перспективы исследования: сб. научн. ст. / под научной редакцией А.М. Мезенко. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2016. – С. 202-205.


## ФАРМІРАВАННЕ КРЫТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ НАВУЧЭНЦАЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ


**Валентава Я.А.,** навучэнка 2 курса
(г. Орша, Аршанскі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава)
Навуковы кіраўнік – Чыкаванава К.А., выкладчык, магістр педагогікі


Галоўная мэта адукацыйнага працэсу – гарманічнае і рознабаковае развіццё асобы. Дасягнуць такой мэты немагчыма, калі сам навучэнец не зацікаўлены ў асабістым развіцці. Таму галоўнае патрабаванне да педагагічнага працэсу – яго суб'ектывізацыя.

Рэпазіторый ВДУ

Стаць суб’ектам навучання вучань зможа толькі ў тым выпадку, калі актыўна ўключыцца ў вучэбны працэс: не будзе чакаць “гатовых” ведаў ад настаўніка, а разам з ім ці самастойна пачне “здабываць” іх. У першую чаргу, суб’екту ўласцівыя такія прыкметы, як актыўнасць, самастойнасць, дзейнасць. Для таго, каб вучань змог стаць суб’ектам, гэтыя якасці ў яго неабходна выпрацаваць, прычым работа над імі пачынаецца ўжо на першай ступені навучання – у пачатковай школе.

Традыцыйныя метады і формы часцей за ўсё выконваюць тлумачальна-ілюстрацыйную функцыю, пры якой вучням адводзіцца пасіўная роля: яны слухаюць, запамінаюць, узнаўляюць пачуты ад настаўніка матэрыял. Але такі падыход да навучання нельга лічыць эфектыўным, бо згодна пірамідзе запамінання засвойваецца: 10% прачытанага, 20% пачутага, 30% убачанага, 50% убачанага і пачутага, 80% таго, што гаварылі самі, 90% таго, да чаго дайшлі самі [2, с. 46].

З названых фактаў вынікае праблема даследавання: неабходнасць падбору і выкарыстання дзейнаснага падыходу ў працэсе навучання. Такі падыход прадугледжвае выкананне канкрэтных дзеянняў вучнямі ў час работы з вучэбным матэрыялам. Гэтыя дзеянні могуць быць разнастайнага характару: знайсці, адказаць, напісаць, скласці, паказаць і г.д., – галоўнае, каб вучні прымалі актыўны ўдзел у іх ажыццяўленні.

Актывізаваць дзейнасць вучняў на ўроку, суб’ектывізаваць працэс навучання ў пачатковай школе дапамагае выкарыстанне інтэрактыўных прыёмаў.

Айчынныя даследчыкі дадзенай праблемы (А.І.Жук, С.С.Кашлеў, С.А.Пуйман, В.У.Чэчат і інш.), разглядаючы шырокія магчымасці выкарыстання гэтых прыёмаў навучання, адзначаюць іх наступныя пазітыўныя моманты:

– “вымушаная” актыўнасць навучаемых;
– самастойная творчая выпрацоўка рашэнняў;
– пастаянная камунікацыя навучэнцаў і педагога ў дыялогавай і палілогавай формах;
– узмацненне матывацыі навучання;
– магчымасць праяўлення рэфлексіўнай дзейнасці [3, с. 232].

У аснове інтэрактыўных тэхналогій ляжыць узаемадзеянне. Інтэрактыўнае педагагічнае ўзаемадзеянне – узмоцненая, мэтанакіраваная дзейнасць педагога і навучэнцаў па арганізацыі ўзаемадзеяння паміж сабой з мэтай развіцця [1, с. 37].

Умоўна працэс узаемадзеяння ў інтэрактыўных методыках можна падзяліць на два віды: узаемадзеяне вучняў з настаўнікам (у час якога вучні атрымліваюць новыя веды, неабходную дапамогу, падтрымку, алгарытм дзеяння); узаемадзеянне з іншымі вучнямі.

На практыцы гэтыя два віды ўзаемадзеяння звязаны паміж сабой, і дакладную мяжу паміж імі правесці бывае цяжка. У час такіх узаемадзеянняў і ўзаемадачыненняў адбываецца актыўная камунікацыя, гэта значыць, развіваецца звязнае вуснае маўленне, бо вучні аказваюцца ў такіх умовах, дзе не размаўляць нельга.

Развіццё звязнай мовы, камунікатыўны падыход да навучання – галоўныя прыкметы курса “Літаратурнае чытанне” ў пачатковых класах. Таму прымяненне настаўнікам інтэрактыўных прыёмаў навучання на такіх занятках апраўдана.

На сучасным этапе любы занятак літаратурнага чытання не абыходзіцца без рэфлексіі, якая звычайна праводзіцца на пачатку і ў канцы ўрока. Яе галоўная задача – стварэнне добразычлівай, канструктыўнай атмасферы паміж удзельнікамі педагагічнага працэсу. На наш погляд, не маюць рацыю тыя настаўнікі, якія прапануюць праводзіць этап рэфлексіі толькі ў канцы ўрока, як падвядзенне яго вынікаў. Не менш значная яна і ў пачатку і ў сярэдзіне ўрока: у пачатку ўрока яна дазваляе настаўніку заўважыць настрой, адчуванне, з якімі прыйшлі на занятак вучні і

Репозиторий ВГУ

прасачыць змены, рух гэтага настрою на працягу ўсяго ўрока. Заўважыўшы змены ў адмоўны бок, настаўнік адразу ж можа высветліць іх прычыну; у такім выпадку вучань адчуе эмацыянальную абароненасць, камфорт, утульнасць.

Прыёмы правядзення рэфлексіі разнастайныя. Напрыклад, *“Каляровы вердыкт”*. Для ажыццяўлення гэтага прыёму неабходна, каб у кожнага навучэнца былі дзве карткі розных колераў (на практыцы мы выкарыстоўвалі зялёны і фіялетавы): адна картка (зялёная) сімвалізуе ўпэўненасць у тым, што вучань ведае вучэбны матэрыял, другая картка (фіялетавая) гаворыць, што вучань не зусім упэўнены ў сваім веданні матэрыялу. Гэты прыём праводзіцца ў пачатку ўрока літаратурнага чытання – для таго, каб высветліць, у каго ўзніклі цяжкасці з падрыхтоўкай дамашняга задання; пасля знаёмства з новымі слоўнікавымі словамі – можа, не ўсе вучні іх зразумелі; пасля знаёмства з новым тэкстам – маглі ўзнікнуць пытанні па зместу, з’явіцца незразумелыя словы, значэнне якіх неабходна растлумачыць; у канцы ўрока – настаўнік атрымлівае адваротную сувязь аб тым, як зразумелі дзеці вывучаны на ўроку мастацкі твор.

Аналагічным чынам могуць быць выкарыстаны і прыёмы *“Градуснік”*, *“Рэфлексіўная мішэнь”, “Графікі”, “Прагноз надвор’я”* і г.д.

Акрамя гэтага, можна вылучыць інтэрактыўныя прыёмы, якія садзейнічаюць падрыхтоўцы вучняў да далейшай работы на ўроку. Напрыклад, *“Алітэрацыя імя”*: кожны вучань павінен даць сабе дадатковую характарыстыку на тую ж літару, з якой пачынаецца яго імя *(Аксана – абаяльная, Ігар – імклівы, Сяргей – сардэчны, Марына – мілая і г.д.)*. Такое заданне падрыхтоўвае вучняў да стварэння характарыстык галоўных герояў мастацкага твора, які будзе вывучацца на ўроку.

Інтэрактыўны падыход выкрыстоўваецца ў час падрыхтоўчай работы да ўспрымання зместу мастацкага твора. Напрыклад, прыём *“Інтэрв’ю”* замяняе звыклую ўступную гутарку. Для ажыццяўлення дадзенага прыёму неабходна выбраць групу “спецыялістаў”, астатнія будуць “карэспандэнтамі”. Напрыклад, пры правядзенні заняткаў па твору *А.Клышкі “Самая лепшая хатка”* для дачы “інтэрв’ю” была вызначана група “спецыялістаў-арнітолагаў”, астатнія вучні рыхтавалі і задавалі свае пытанні, тыпу:

- *Назавіце пералётных птушак.*
- *Якая птушка першай прылятае вясной на Беларусь?*
- *Вызначыце, каму належаць гнёзды (прыведзены малюнкі гнёздаў).*
- *Які ўклад могуць зрабіць школьнікі ў ахову птушак? і г.д.*

Дадзены прыём патрабуе ўмення дакладна ставіць пытанні, адказы вымагаюць ад вучняў правільнай пабудовы выказвання, акрамя маўленчай накіраванасці “інтэрв’ю” дазваляе актывізаваць мысленчую дзейнасць вучняў, уменне хутка арыентавацца ў сваіх ведах, паказвае, наколькі развіты кругагляд вучняў.

Хацелася б спыніцца на прыёме *“Рамбічны рад”*. У трэцім класе вывучаецца твор *М.Янчанкі “А таму!”*, галоўная думка якога – даражы сяброўствам. Апавяданне накіравана на выпрацоўку адпаведных маральных якасцяў, адказнасці за свае ўчынкі і за тых, хто знаходзіцца пабач з табой. У час замацавання для таго, каб высветліць, ці зразумелі вучні галоўную думку мастацкага твора, ці зрабілі для сябе адпаведныя вывады, мы выкарысталі прыём рамбічнага раду. Вучням было прапанавана пабудаваць рад якасцей чалавека, якія, на іх думку, неабходныя для таго, каб быць сапраўдным сябрам: замест кропак неабходна ўпісаць якасці чалавека, у самым версе – найбольш значныя для тых, хто складае рамбічны рад, а ўнізе – менш значныя. У выніку замацаванне адбылося без надакучлівых пытанняў і прынесла больш карысці, чым традыцыйны падыход, бо ўсе вучні актыўна стваралі свой рад, падбіраючы вядомыя ім чалавечыя якасці.



Репозиторий ВГУ

Развіццю лагічнага мыслення праз арганізацыю лексічнай камунікацыі вучняў пачатковых класаў спрыяе *"Лагічны ланцужок"*: кожнаму вучню на выбар прапаноўваецца адна картка са словазлучэннем ці асобным словам. Гэтая картка – адно звяно, на аснове усіх сабраных звёнаў неабходна пабудоваць свой лагічны ланцужок, растлумачыўшы свой выбар. Гэты прыём мы выкарыстоўвалі для праверкі першаснага ўспрыняцця мастацкага твора. Так, пасля знаёмства вучняў з творам *А.Васілевіч "Пажар"*, ім былі прапанаваныя два ланцужкі, якія неабходна сабраць, абгрунтаваўшы свае дзеянні: *"Дзеці": Маня, Ганька, Анюта, Грыша, частаванне, свята, смех, кавалак пірага, салодкія аладкі, скачуць; "Пажар": вогнішча, на Палянцы, сухое ламачча, агонь хітруе, сухая галінка, агонь шалее, бойка з пажарам, чорнае пажарышча.* У час пабудовы сваіх "ланцужкоў" дзеці актыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, рухаюцца – на дадзеным этапе правядзення гэты прыём можа замяніць сабой фізкультхвілінку.

Ствараючы "лагічныя ланцужкі", вучні ўспамінаюць, як разгортваліся дзеянні ў творы, хто галоўныя героі, такім чынам яшчэ раз перажываючы падзеі, апісаныя ў мастацкім тэксце.

Дапамагае развіццю звязнай мовы вучняў на ўроках літаратурнага чытання сістэматычнае выкарыстанне *"Хвіліны гаварэння"*. Сутнасць дадзенага прыёму наступная: настаўнік называе канкрэтнае слова або вучні, выкарыстаўшы прыём *"Адно слова"*, вызначаюць яго (самае галоўнае слова з твора, з галоўнай думкі). Далей дзецям прапануецца скласці тэкст пра гэтае слова, расказаць усё, што з ім звязана, выказаць свае пачуцці па дадзенаму слову, прыгадаць нейкі ўчынак. Выказванне вучня займае роўна адну хвіліну, пасля сканчэння якой слова даецца іншаму. *Напрыклад, пры вывучэнні твора-байкі М.Танка "Жук і слімак" прапаноўвалася слова "дапамога", пры знаёмстве з публіцыстычным апавяданнем П.Клімука "На касмічным караблі" – "касмічны палёт", пры рабоце над народнай казкай "Зароблены рубель" – "праца"*. На пачатковым этапе прымянення гэтага прыёму ключавое слова можна прапаноўваць дзецям дамоў, паступова для большай эфектыўнасці рэалізоўваць гэты прыём толькі ў класе, бо ў такім выпадку мысленне будзе працаваць больш актыўна, вучань сканцэнтруецца на галоўным. Прыём *"Хвіліна гаварэння"* спрыяе развіццю індывідуальнай свядомасці, мыслення і творчага ўяўлення школьнікаў.

Практычны вопыт выкарыстання інтэрактыўных методык на ўроках літаратурнага чытання дэманструе наступныя вынікі:

- цікавасць вучняў да ўрокаў беларускага літаратурнага чытання ўзрастае,
- павялічваецца актыўнасць школьнікаў у час заняткаў,
- развіваецца звязная мова вучняў,
- удасканальваюцца мысленчыя аперацыі школьнікаў: логіка разваг, класіфікацыя, аналіз, сінтэз, абагульненне і інш.

Спіс цытаваных крыніц:

1. Кашлев, С.С. Интерактивные методы обучения педагогике/ С.С. Кашлев. – Мн.: Выш. шк., 2004. – 176 с.
2. Сыско, И.Н. Использование интерактивных методов в обучении младших школьников / И.Н.Сыско// Материалы I Республиканской научно-практической конференции. – Гродно, 2003. – 175 с.
3. Чечет, В.В. Возможности технологии интерактивного обучения в преподавании педагогики / В.В.Чечет // Материалы Международной научно-практической конференции. – Мн.: БГУ, 2004. – 372 с.



Репозиторий ВГУ